**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| |
|---|
| ЛОТ № 1: капитальное строение, инв. № 441/С-15679 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – здание кафе), площадью 181,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Ивье, ул. 1 Мая, 7, с оборудованием: ванна цельнометаллическая, ванна цельнотянутая одногнездовая, счетчик для воды, перила кованные, навес к входной двери кованный и столбы кованные, 2 шт.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый номер 422950100001002762, площадью 0,0459 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания кафе), расположенном по адресу: г. Ивье, ул. 1 Мая, 7.<br>Начальная цена продажи – 142 695 руб. (сто сорок две тысячи шестьсот девяносто пять рублей) с учетом НДС.<br>Сумма задатка – 14 269 руб. (четырнадцать тысяч двести шестьдесят девять рублей) |
| Условия проведения аукциона – аукцион без условий |
| **Продавец – Лидский филиал Гродненского областного потребительского общества, 231300, г. Лида, ул. Фурманова, 19, тел. 8-0154-611381** |
| **Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70** |
| Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 28 сентября 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержится на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/ |
| **Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 212, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.** |
| **Последний день приема заявлений – 24 сентября 2020 г. до 15.00** |

**Телефон для справок: 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/**

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| **Продавец** | **ОАО «МЭТЗ ИМ. В. И. КОЗЛОВА», г. Минск, ул. Уральская, д. 4, каб. 502** |
| **Предмет аукциона** (одним лотом)<br>Адрес – **Минская обл., Логойский р-н, Швабский с/с, 22** (район д. Молоди) | |
| **Подсобное сельское хозяйство Молоди** в составе: **бригадный дом** (142,2 кв. м, 601/С-24768, составные части: беседка, дороги и площадки, пож. водоем), **закрытая стоянка для сельхозтехники** (926,6 кв. м, 601/С-25747, составные части: площадки), **открытый навес для сельхозмашин** (367,4 кв. м, 601/С-25774), **здание коровника** (2000,1 кв. м, 601/С-25791), **здание склада** (158,5 кв. м, 601/С-25779), **склад для хранения материалов** (23,3 кв. м, 601/С-25777), **зернохранилище** (403,3 кв. м, 601/С-25744), **навес для хранения подстилающего материала** (51,4 кв. м, 601/С-25776), **траншея для хранения навоза** (601/С-25771), **навес над дезбарьером** (40,6 кв. м, 601/С-25778), **пункт технического обслуживания** (112,1 кв. м, 601/С-25775), **ТП** (100,4 кв. м, 601/С-25790), **АЗС** (601/С-25787, составные части: топливораздаточная колонка, резервуар, 3 емкости, будка КУНГ м/к, 2 молниеотвода, ограждение склада ГСМ), **водонапорная башня, артезианская скважина со зданием** (601/С-25772), **сети канализации** (730 м, 601/С-27775, составные части: колодцы, поля фильтрации), **сеть водопровода** (701 м, 601/С-27776, иное имущество (можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.cpo.by) | |
| ***Обременения***: частичная аренда 3 этажа в бригадном доме | |
| ***Сведения о земельном участке***: пл. **5,6217 га,** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания зданий и сооружений ПСХ. Ограничения (обременения) прав: охранная зона линий электропередач напряжением свыше 1000 вольт, пл. 0,2181 га | |
| **Начальная цена с НДС – 572 785,06 бел. руб.** (снижена на 10 %) | |
| **Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки» | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, условия оплаты предмета аукциона, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона оговорены в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by | |
| Предыдущие извещения о проведении аукциона опубликованы в газете «Звязда» от 21.09.2019 | |
| Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия | |
| **Дата и время проведения аукциона: 09.09.2019 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703. **Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 07.09.2020 до 17.00** по указанному адресу | |

**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ООО «БЕЛГАЗНАЛАДКА»**
**(Продавец)**

**ЛОТ № 1: ЗДАНИЕ ИНЖЕНЕРНО-ЛАБОРАТОРНОГО КОРПУСА**
**(литер А 4/к-кп), инв. № 500/С-28176, 3078 кв. м.**

Адрес: г. Минск, ул. Гурского, 32. **Обременения:** – Аренда. Земельный участок: кадастровый номер 500000000005001607, площадь 0,2998 га. Начальная цена с НДС – 2 499 000,00 бел. руб. **Аукцион состоится 25.09.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.** Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

# ДА СТА ГАДОЎ БЕЗ СТАРАСЦІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***



**У сваіх успамінах ветэран і сёння выразна бачыць далёкія дні вайны.**

— Сто гадоў пражыць — не поле перайсці, — кажа юбіляр. — Усё было: і ўзлёты, і падзенні. Асабліва ў нашага пакалення, на долю якога выпала шмат цяжкасцяў. Па-першае, Вялікая Айчынная вайна, страшная вайна. Пасля вайны неабходна было аднавіць народную гаспадарку, якую цалкам разбурылі захопнікі.

Аляксандр Іванавіч помніць літаральна кожную старонку гэтай апошняй вайны. Ён удзельнічаў у баях на Буйніцкім полі, а таксама ў абароне Магілёва.

— На Буйніцкім полі адбывалася бессмяротная бітва. Абаронцы Магілёва стаялі да апошняга патрона, да апошняга байца. Вада ў Дняпры стала барвовай ад крыві салдат, — згадвае мой суразмоўнік.

На Буйніцкім полі чырвонаармеец падбіў два танкі праціўніка, за што быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга. Гэты ордэн выратаваў яму жыццё, калі варожая куля ад яго зрыкашэціла.

Аляксандр Слабада прымаў удзел у абарончых баях пад Вязьмай, Малаяраслаўцам, Падольскам, а таксама ў контрнаступленні пад Масквой, дзе быў паранены.



**Гэты ордэн у баі выратаваў жыццё ветэрану — куля варожага снайпера слізганула па паверхні металу.**

Тады ўрачы яму ледзьве не ампутавалі нагу. Але малады арганізм адужаў, рана загаілася.

— Я, вясковы хлопец, ніколі не быў у сталіцы нашай Радзімы. Таму пасля выпіскі папрасіўся пагуляць па горадзе. Мне далі ў суправаджэнне медсястру. У метро на станцыі «Сокал» пасажыры цягніка мне пачалі саступаць месца. Затым мы зайшлі ў цырульню, дзе мяне падстрыглі, пагалілі, адэкалонілі. І адмовіліся ўзяць грошы, маўляў, вы ж герой, Маскву абаранялі. Упершыню я пабываў у Вялікім тэатры оперы і балета, дзе ішла пастаноўка «Івана Сусаніна». У касе не было білетаў, і мяне правялі пасля таго, як пачаўся спектакль. Я не надта разбіраўся ў мастацтве, але опера спадабалася, — расказаў Аляксандр Іванавіч.

Пасля шпіталя яго накіравалі на Калінінскі фронт, а ў 1942-м — у тыл праціўніка на Віцебшчыну, дзе ён стаў камандзірам атрада № 3 партызанскай брыгады імя Ленінскага камсамола. Атрад дзейнічаў у Суражскім і Гарадоцкім раёнах. Напярэдадні вызвалення гэтай мясцовасці ад захопнікаў камандзір быў цяжка паранены і самалётам эвакуіраваны на Вялікую зямлю.

— Мой бацька таксама ваяваў у партызанскім атрадзе брыгады Героя Савецкага Саюза Захарава, а маці займалася хатняй гаспадаркай. Прадукты харчавання перадавала ў лес. Аднойчы тата пайшоў у вёску, каб забіць парсюка і прынесці сябрам па зброі свежыну. Але знайшоўся мярзотнік, які данёс пра гэта паліцаям. Бацькоў забралі і павезлі ў Асвейскую турму. Цётка, маміна сястра, пайшла даведацца пра іх лёс. Ёй сказалі, што іх расстралялі ў парку. Яны ляжалі са скручанымі калючым дротам рукамі. Маіх родных пахавалі на малой радзіме ў вёсцы Дубровы Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці. Я паставіў ім помнікі, добраўпарадкаваў магілы, якія наведваю амаль кожны год, — расказвае з хваляваннем Аляксандр Іванавіч.

З цеплынёй ветэран згадвае сваю работу на пасадзе першага сакратара Любанскага райкама партыі, людзей, з якімі працаваў. «Калі асушалі балоты, то мужчына выкінуў драўляную лапатай 70 тон зямлі. Вось такія былі людзі», — захапляецца палешукамі мой суразмоўнік.

Любанская зямля вырасціла і выхавала 18 Герояў Сацыялістычнай Працы. Гэтае ганаровае званне прысвоена і Аляксандру Слабадзе Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 сакавіка 1966 года з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Серп і Молат». Гэта была цалкам заслужаная выдатнай і вынікoвай працай узнагарода за высокія паказчыкі ў жывёлагадоўлі: прывагі, надоі, нарыхтоўку сельскагаспадарчай прадукцыі.

**Любанская зямля вырасціла і выхавала 18 Герояў Сацыялістычнай Працы. Гэтае ганаровае званне прысвоена і Аляксандру Слабадзе Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 сакавіка 1966 года з уручэннем ордэна Леніна і медаля «Серп і Молат». Гэта была цалкам заслужаная выдатнай і вынікoвай працай узнагарода за высокія паказчыкі ў жывёлагадоўлі: прывагі, надоі, нарыхтоўку сельскагаспадарчай прадукцыі.**

— Я цесна звязаны з гісторыяй вашай газеты «Звязда», — канстатаваў Аляксандр Іванавіч. — Бываў у доме, дзе яна выдавалася ў вайну. — Я аднаўляў зямлянкі на востраве Зыслаў на месцы партызанскага лагера. Рабочы дзень заканчваўся — збіраю актыў і паехалі. Насілі камяні, укладвалі бярвенні. І ўсё ўручную. Праходзіць дзень, а архітэктар выказвае новую ідэю. Даводзілася ўсё перарабляць нанава. Мы таксама збіралі астанкі людзей, што загінулі ў гэтых мясцінах, і хавалі іх у брацкай магіле, на якой уладкавалі стэлу.

— Аляксандр Іванавіч, вы першы доўгажыхар у вашым родзе? — пацікавілася я.

— Мой прадзед пражыў 98 гадоў. Помню, ён вырошчваў самасад і шмат курыў. Але да апошняга часу сам калоў і сек дровы.

Аляксандр Іванавіч раней шмат чытаў, але цяпер дрэнна бачыць. На дапамогу яму прыходзіць дачка Таццяна Аляксандраўна:

— Што б ні здарылася, бацька заўсёды пазітыўна, з дабрынёй адносіўся да сваіх падначаленых, людзей, ні пра каго не сказаў дрэннага слова. Магчыма, у гэтым прычына яго даўгалецця, — лічыць дачка. — Ён заўсёды казаў, што ў Любані цудоўныя людзі. Мы, дзеці, ведалі кіраўнікоў, старшынь калгасаў па імёнах. Яны ўсе сябравалі, іх звязвалі не толькі працоўныя, але і душэўныя чалавечыя адносіны. Падчас кіраўніцтва Камітэтам народнага кантролю тата таксама з разуменнем і цеплынёй ставіўся да людзей. Ён пазнаёміўся са сваім зяцем, маім мужам, нават раней за мяне.

— Маладому спецыялісту даручылі праверку наконт вылічальнай тэхнікі ў адным аб'яднанні, — працягвае жанчына — Па яе выніках з інфармацыяй ён прыйшоў да свайго кіраўніка. І, як потым прызнаваўся, яго вельмі здзівіла, што чыноўнік высокага рангу выйшаў з-за стала, павітаўся, запрасіў сесці насупраць і ўважліва выслухаў. У бацькі заўсёды было шмат захапленняў: паляванне, рыбалка, вельмі любіў чытаць ваенныя мемуары. Ён і цяпер цікавіцца палітыкай, падзеямі ў Беларусі, Расіі.

Словам, Аляксандр Іванавіч, займае актыўную жыццёвую пазіцыю, яму цікава ўсё, што адбываецца навокал. А яшчэ яму ўласціва пачуццё гумару. Ён не страціў у свае сто гадоў смаку да жыцця.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**